# ТОМА НІГЕР – ПАПСКІ НУНЦЫЙ У ПОЛЬШЧЫ (1522-1523 гг. )

***А. К. Шымак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, вул. Мендзялеева, 36, 220030, г. Минск, Беларусь,helenaszymak@gmail.com*

Жыццё і дзейнасць выдатнага ўраджэнца Спліту, дыпламата, нунцыя, кніжніка Тома Нігера найбольш вядомыя ў харвацкіх навуковых колах. Але ж яго дыпламатычная дзейнасць, накіраваная на арганізацыю супраціву асманскаму ўварванню не толькі ў Харватыю, але і ў іншыя еўрапейскія краіны ў XVI ст., заслугоўвае ўвагі і іншых гісторыкаў, у тым ліку і беларускіх. У 1522–1523 гг. Тома Нігер выконваў функцыі папскага нунцыя ў Польшчы і праводзіў перамовы з Жыгімон Старым.

***Ключавыя словы:*** дыпламатыя; антыасманская кааліцыя; нунцый.

# ТОМА НИГЕР – ПАПСКИЙ НУНЦЫЙ В ПОЛЬШЕ (1522-1523)

***Е. К. Шимак***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, helenaszymak@gmail.com*

Жизнь и деятельность выдающегося уроженца Сплита, дипломата, нунция и культурного деятеля Тома Нигера наиболее известны в хорватских научных кругах. Но его дипломатическая деятельность, направленная на организацию сопротивления османскому нашествию не только в Хорватию, но и в другие европейские государства XVI века, заслуживает внимания и других историков, в том числе белорусских. В 1522–1523 гг. Томас Нигер выполнял функции папского нунция в Польше и вел переговоры с Сигизмундом Старым.

***Ключевые слова:*** дипломатия; антиосманская коалиция; нунций.

# THOMAS NIGER – PAPAL NUNZIO IN POLAND (1522-1523)

***A. Shymak***

*Belarusian State University,*
*Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, helenaszymak@gmail.com*

The life and work of the distinguished Split native, diplomat, nuncio and cultural figure Tom Niger is best known in Croatian scientific circles. But his diplomatic activities, aimed at organizing resistance to the Ottoman invasion not only in Croatia, but also in other European countries of the 16th century, deserve the attention of other historians, including Belarusian ones. In 1522-1523 Thomas Niger served as papal nuncio in Poland and negotiated with Sigismund the Old.

***Keywords:*** diplomacy; anti-Ottoman coalition; nuncio.

У снежні 1521 г. памёр папа Леў X. Пантыфікам стаў Адрыян Флорэнс, прыняўшы імя Адрыян VI. Новаабраны папа, вельмі адукаваны чалавек, прафесар тэалогіі, рэктар Лувенскага ўніверсітэта, паставіў перад сабой

дзве асноўныя задачы: правесці ўнутраныя рэформы ў Касцёле, пазбавіўшы яго празмернай раскошы, а таксама арганізаваць кааліцыю еўрапейскіх дзяржаў супраць Асманскай імперыі [3]. Знешнепалітычная сітуацыя была вельмі складанай, а пасля захопу туркамі Белграда і вострава Родас, яшчэ пагоршылася. Узаемаадносіны краін усходняга рэгіёну Еўропы таксама цікавілі Апостальскую Сталіцу. У гэты час вялікая колькасць дыпламатаў, падарожнікаў, гандляроў курсіравалі паміж Масквой і Рымам. І, нягледзячы на тое, што яны і не мелі за мэту падтрымаць кантакты маскоўскага вялікага князя з папствам, тым не менш, дзякуючы ім, цікавасць у Заходняй Еўропе да «Масковіі» не згасала. Разнастайныя «запіскі аб Масковіі», якія з’яўляліся ў гэты ж час, дзе маляўніча ілюстраваліся стан веры, царкоўная іерархія, паказваліся спосабы каталіцкага місіянерства, не маглі заставацца без увагі Апостальскага Прастола, а некаторыя ж з іх непасрэдна былі складзены па распараджэнні з Рыма.

А вось пастаянныя войны паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскім княствам перашкаджалі справе кааліцыі. На неаднаразовыя заклікі папярэдняга пантыфіка да міру дзеля сумеснай барацьбы кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Стары адказваў, што ён не мае такой магчымасці, бо вядзе войны з татарамі і Масквой. І менавіта ў такі час, калі пытанне арганізацыі антыасманскай кааліцыі найбольш хвалявала папу, калі было неабходна прыкласці адмысловыя дыпламатычныя здольнасці, каб прымірыць варагуючыя бакі, і так, каб ніхто не адчуваў, што яго інтарэсы ўшчамляюцца, у студзені 1522 г. папа прызначае сваім нунцыем Тома Нігера [1, p. 199]. Рэгіён, які належаў да яго кампетэнцыі, быў вельмі немалым і дастаткова «праблемным» – Венецыя, Венгрыя, Чэхія і Польшча.

Тома Нігер, якога неаднаразова называлі італьянцам, насамрэч быў харватам і паходзіў са спліцкага роду Črne, або Crnić. Ён сам падаваў сваё прозвішча на лацінскай мове, як «Нігер», і гэта трывала замацавалася ў гістарычных крыніцах. Нарадзіўся Тома Нігер у Спліце дзесьці каля 1450 г., пад 1487 г. ёсць згадкі пра яго як прафесара граматыкі ў Хвары. У 1494 г. стаў святаром, і дзякуючы выдатнаму валоданню лацінскай і італьянскай мовамі хутка пайшла ўгору яго кар’ера – ён стаў сакратаром арцыбіскупа Спліту Бернарда Занні.

Новы нунцый быў не толькі выдатным дыпламатам, але і гарачым прыхільнікам ідэі агульнаеўрапейскай антыасманскай барацьбы. Справай яго жыцця стала арганізацыя абароны Балкан ад Турцыі [5]. На пачатку мая

1512 г. Тома Нігер браў удзел у V Латэранскім саборы1. І менавіта ён быў аўтарам прамовы, з якой выступіў спліцкі арцыбіскуп падчас адкрыцця сабору. У гэтым дакуменце прагучаў заклік аб'яднаць усе хрысціянскія сілы супраць Асманскай імперыі. У 1514 г. Нігер стаў асабістым сакратаром і генеральным вікарыем бана Харватыі Петра Берыславіча, які адначасова з'яўляўся і біскупам Веспрэма. З гэтага часу з дыпламатычнымі візітамі харвацкі дыпламат наведаў амаль усе краіны Еўропы. Зразумела, што і Рым быў на шляху яго дыпламатычных місій. Некалькі разоў ён сустракаўся з папам Львом X, для якога справа абароны ад туркаў была вельмі блізкай.

У 1520 г., згодна з папскай буллай, Тома Нігер быў прызначаны біскупам-суфраганам Скрадзіна і папскім легатам у Харватыі. Як сведчаць крыніцы, у 1520 г. ён быў накіраваны з пасольскай місіяй да імператара Карла V. Тома Нігер павінен быў пераканаць імператара ў тым, што Харватыя знаходзіцца ў моцнай небяспецы і што трэба тэрмінова аб'яднаць усе сілы супраць ворагаў хрысціянства. Новаабраны папа Адрыян VI падтрымаў запал Тома Нігера і прызначыў яго сваім нунцыем, дзеля арганізацыі антыасманскай кааліцыі. Гістарычныя крыніцы сведчаць пра тое, што новы нунцый цікавіўся справай абароны ад туркаў больш, чым якім іншым пытаннем [2, p. 152].

У студзені 1523 г. адбылася сустрэча Тома Нігера і Жыгімонта Старога, які з горыччу звярнуў увагу, што ён па-ранейшаму адзін, без аніякай дапамогі змагаецца з саюзнікамі туркаў – татарамі, а таксама са «схізматыкамі» [1, p. 140–141]. У гэты ж час меў месца канфлікт адносна вакантнай біскупскай пасады ў Плоцкай дыяцэзіі. Жыгімонт Стары быў супраць кандыдатуры новага біскупа, якую прапанаваў папа. У рэшце рэшт, пры актыўным удзеле нунцыя, гэтае пытанне было вырашана на карысць інтарэсаў Жыгімонта Старога.

У Рыме 30 красавіка 1523 г. была абвешчана ўрачыстая була «Monet nos veritas», якая чарговы раз заклікала еўрапейскіх манархаў да заключэння трохгадовага перамір'я паміж варагуючымі бакамі [2, p. 271–274, № 236]. Папа Адрыян VI і Клімент VII (1523–1534), які змяніў яго, імкнуліся арганізаваць яшчэ адзін агульнахрысціянскі крыжовы паход. Не апошнюю ролю ў ім мусіла адыгрываць Карона Польская. Але спробы Рымскай курыі завязаць на гэтай аснове перамовы з Масквой не толькі

[1] На пасяджэннях Латэранскага сабора браў удзел і прымас польскі, арцыбіскуп гнезненскі Ян Ласкі. На аўдыенцыі ў папы Льва X ён паведаміў пра небяспеку, якая навісла над хрысціянствам, а ў першую чаргу над Каронай Польскай і Венгрыяй, з боку туркаў, татараў, а таксама Масквы.

адштурхоўвалі Жыгімонта Старога ад ідэі антыасманскай лігі, але і зніжалі перспектывы перамоў з вялікім князем маскоўскім.

Падчас выканання сваёй місіі нунцый Нігер здолеў так далікатна вырашыць усе вострыя пытанні, што пакінуў пра сябе ў Кракаве толькі прыемныя ўспаміны. У 1523 г. у адным з лістоў, накіраваных у Рым, было адзначана, што, калі б папа заўсёды накіроўваў такіх паслоў, то можна б было пазбегнуць шматлікіх праблем у Касцёле [2, p. 224]. Дыпламатычная місія нунцыя Нігера была расцэнена як паспяховая, і ў якасці ўзнагароды ён атрымаў бенедыктынскае абацтва паблізу Турына.

Нунцый Тома Нігер, пакінуўшы тэрыторыю Польшчы, працягваў заставацца папскім легатам у справе абароны Харватыі [5]. У 1524 г. стаў біскупам Трогіра. Справа яго жыцця – абарона Балканаў ад туркаў – фактычна завяршылася пасля Мохачскай бітвы 1526 г. З гэтага часу Тома Нігер жыў у родным Спліце, дзе і памёр прыблізна ў 1531 г.

Выдатны знаўца гісторыі нунцыятуры, польскі даследчык Г. Д. Вайтыска звярнуў увагу, што вобраз жыцця гэтага мудрага, адданага сваёй працы нунцыя-славяніна можна таксама дапоўніць і нарысамі пра яго сапраўдную рэлігійнасць і святарскае служэнне [6, p. 147–148]. Такім чынам, можна адзначыць, што дэтальнае вывучэнне гісторыі польскай нунцыятыры раскрывае асаблівасці дыпламатыі Апостальскай Сталіцы ў рэгіёне, яе асноўныя мэты і задачы. Асоба нунцыя Тома Нігера сведчыць пра тое, што выбар папскага легата адбываўся неспантанна, і нават непрацяглая дыпламатычная місія мела свае асаблівасці і наступствы.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Acta Nuntiaturae Polonae. Roma: Institutum Historicum Polonicum, 1990. T. I / auctore H. D. Wojtyska.
2. Acta Tomiciana. Epistole, legationes, responsa, actiones, res gestae... Sigismundi... Primi... per Stanislaum Gorski... collecte et in tomos XXVII digestae : w XVIII t. Posnaniae, 1853. T. VI : 1522–1523.
3. Hocks, Else.  Freiburg: Herder Verlag, 1939.
4. Povijest Hrvata. Knj. 2: Od kraja 15. st. do kraja Prvog svjetskog rata / Mirko Valentić, Lovorka Čoralić. Zagreb: Školska knijga, 2005.
5. Škunca, Stanko Josip. Toma Niger Mrčić – diplomat i humanist / S. J. Škunca. – Pula, 2000. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://https://hrcak. srce. hr/file/18755 – Дата доступа: 01. 09. 2023.
6. Wojtyska H. D. Toma Crnić jedyny Słowianin-nuncjusz w Polsce 1522–1523 // Zeszyty naukowe Uniwersytetu Jagiellońskiego. Prace Historyczne. 1989. Z. 89. S. 139–148.